


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 6 (234) 9 мая 1996 года, чацвер


# Са святам Перамогі!




*У пяцьдзесят першы раз адзначаецца самае ўрачыстае і знамянальнае свята нашага народа - Дзень Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 1418 дзён і начэй доўжылася тая жудасная вайна, якая зруйнавала гарады і вёскі, пакалечыла мільёны людскіх душ, пахавала ў зямлі лепшых сыноў і дачок.*

*Шлях да Перамогі быў цяжкім і доўгім.*

*Прайшлі яго і многія нашы калегі, якія сёння працуюць ва універсітэце. Для іх гэта быў найбольш горкі час выпрабаванняў, калі смерць падпільноўвала на кожным кроку і, можа, толькі шчаслівая выпадковасць давала шанц застацца ў страі, дачакацца Вялікага і светлага Дня Перамогі.*

*Больш чым паўстагоддзя прайшло, выраслі новыя пакаленні, а нашы ветэраны і сёння непадуладныя часу. Іх энергіі, бадзёрасці, жыццястойкасці можна па-добраму пазайздросціць.*

*За Вашу шматгадовую плённую працу дзякуй усім Вам, шаноўныя ветэраны вайны!*

*Заставайцеся ў працоўным страі як мага даўжэй. Няхай не баляць раны, нанесеныя вайной, на Вашым целе і ў сэрцы. Няхай яшчэ доўгія гады памяць Ваша ўваскрашае старонкі гісторыі вайны, мужнасці і гераізму народа-пераможцы, каб Вы маглі зноў і зноў расказваць аб гэтым маладому пакаленню. Няхай яно ўбачыць і адчуе вайну праз Вашы вочы, праз Ваш голас, праз Ваша сумленне.*

*Вялікае дзякуй Вам, шаноўныя калегі, за ўсё, што зрабілі Вы для Вялікай Перамогі, дзякуй за тое, што свае веды і вопыт, не шкадуючы, аддаеце моладзі. Жывіце доўга, у добрым здароўі і з пачуццём выкананага абавязку!*

*Са святам Вялікай Перамогі ўсіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў універсітэта! Зычу не толькі мірнага майскага неба, але і міру ў сем'ях і сэрцах.*

*Л.М. КІВАЧ,*
*рэктар універсітэта.*

# БЫЎ МЕСЯЦ МАЙ...

Які незвычайны ў яго жыцці месяц май! У маі нарадзіўся сам - у Хойніках, глыбінцы беларускага Палесся. У маі любімая жонка падарыла яму сына - першынца, майскія - трое ўнукаў Якава Ісакавіча Будоўскага. У маі далёкага ўжо 1951, заканчваючы Ленінградскі педінстытут імя Герцэна, атрымаў надзею, што будзе працаваць у Гродне, распачынаючы вялікую справу навучання сляпых дзяцей. Асобная дата яго жыцця - 9 Мая, Дзень Перамогі. Шмат мірных вёсен запар, абавязкова ў гэты дзень, ён рабіў запісы ў сваіх дзённіках. На вялікі жаль, не захаваўся самы галоўны сшытак. У час ранення, заліты крывёю, ён прыйшоў у непрыгоднасць, так і згубіўся недзе ў шпіталі. Хто тады думаў, што такая памяць будзе святою... Так што галоўныя падзеі, самае пекла вайны засталіся ўспамінам. Аднак час ад часу ў сваіх запісах у Дзень Перамогі ён вяртаўся да ваенных падзей зноў і зноў...

Ён стаў педагогам, спецыялістам ў навучанні тых, хто страціў зрок, бо калі згубіў зрок сябра-франтавік Бацькі, аслеп літаральна перад самай Перамогай, ён даў сабе слова навучыцца дапамагаць людзям з такім трагічным лёсам. А мог бы стаць пісьменнікам, бо з маленства валодаў талентам літаратурнага пісьма, лёгка рыфмаваў вершы, са школьнай парты вёў падрабязныя дзённікі, шмат разважаючы, аналізуючы.

(Заканчэнне на 3-й стар.)



# Всем событиям - событие

*Разам са сваімі аднагодкамі В.І. Атрэшчанкаў стаў папаўненнем на фронце ў 1944 г. Хударлявы, невысокага росту, тады ён ледзь-ледзь мог дастаць выцягнутымі пальцамі да ляза штыка сваёй вінтоўкі. І ўсё ж яму, як і тысячам такіх жа сыноў і абаронцаў Радзімы, было наканавана прайсці пераможцамі па дарогах Беларусі, Польшчы, Германіі. Фашысцкая армія, павернутая ў сваё логава, у прадчуванні ганебнага паражэння аказвала жорсткае супраціўленне. Праз яго і прайшоў малады рускі салдат Атрэшчанкаў. Пасля вайны - некалькі гадоў службы ў Германіі, ваеннае вучылішча, Закаўказзе, Курыльскія астравы, вучоба ў Варонежскім універсітэце, а з 1965 года - праца ў Гродне. І вось ужо амаль тры дзесяцігоддзі ў нашым універсітэце. Ветэран узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума медалямі "За баявыя заслугі", "За вызваленне Варшавы", "За ўзяцце Берліна", "За перамогу над Германіяй", шматлікімі юбілейнымі.*

*По просьбе рэдакцыі Віктар Іванавіч дзеліцца сваімі ўспамінамі пра Перамогу, пра вайну, пра час...*



Фронтовая жизнь семнадцати-восемнадцатилетнего солдата, прошедшего и проползшего по лесам и полям, весям и городам Белоруссии, Польши, Германии (1944-45 гг.), полна бессчетными и бесчисленными случаями и событиями. Они возникали, как и уходили, ежечасно, постоянно, быстро сменяя друг друга, как в калейдоскопе. Трудно какому-то отдать предпочтение. И все же, по глубине впечатления, по роли, по значимости, по популярности было такое событие, венчающее, завершающее собой все другие. Это - День Победы, 51-ю годовщину которого отмечаем сегодня.

Победа застала меня, тогда солдата - фронтовика с годичным опытом вблизи тихого, уютного, благоухающего весенними садами немецкого городка Рослау на Эльбе, куда мы вышли после окружения и уничтожения в трудных, долгих и кровопролитных боях большой группировки немецких войск. Здесь, на Эльбе, за три-четыре дня до Победы для меня и моих однополчан война была закончена. Впереди, через Эльбу, вражеских войск уже не было. Там были союзники - американцы.

О нашей полной и окончательной Победе впервые я услышал с наступлением сумерек 8 мая, находясь на дежурстве по штабу полка. Сразу же полетела депеша в подразделения полка с извещением о Победе и с предписанием всем командирам достойно встретить это событие и как следует его отметить...

Какое началось ликование! Трудно найти подходящие слова, чтобы отразить то душевное состояние солдат и офицеров: счастье, радость, беспредельная радость, как гимн Победе, такой нелегкой, такой долгожданной. Как мне вспоминается теперь, эта всеобщая радость тогда была безграничной и безумной. В ночь с 8 на 9 мая, как только было сообщено о капитуляции Германии, вся наша и американская округи дислокации войск наполнились сплошным гулом и заревом оружейной стрельбы и ракетниц, громогласным "Ура!", объятиями, поздравлениями, всеобщим ликованием, застольем. Тогда я, и не только я, впервые осмыслил, что наконец-то закончились муки ада, что уже не придется жить в окопах, траншеях, землянках, блиндажах, кое-как есть, пить и спать порой под открытым небом, под плащ-палаткой на земле, на снегу, а если на хвойном лапнике, так это был верх блаженства. А порой ведь не спали по несколько суток подряд. Радостно было осознавать, что перед тобою уже нет и не будет врага, несущего тебе смерть или увечье. Успокаивало душу и то, что уже не придется смотреть на врага через бинокль или стереотрубу, через прорезь пушки или прицела и в нужный момент нажимать на спусковой крючок табельного оружия. Бесконечно был рад тому, что в конце концов остался жив, здоров, хотя и перенес большую контузию и небольшое ранение. Представлял, как рады будут мама, отец, младшие братья и сестры, которых дома оставалось пятеро, как обрадуются встрече все родные, близкие, знакомые, да мало ли еще кто...

Не покидало и чувство сострадания: не все смогли, приближая Победу, прийти к ней. Не было среди нас таких, кто в этой войне не потерял близких и дорогих людей, товарищей по оружию. Светлая память и Царствие Небесное им и всем тем, кто не дожил до 51-й годовщины Победы.

Дорого досталось нам эта Победа. Ее ничем не измерить и не взвесить. Единственный критерий ее ценности - торжество добра над злом. Так оценивал я ее тогда, так оцениваю и теперь. Это ценность, неподвластная ревизии и переоценке. К сожалению, приходится нам, ветеранам, слышать упреки прямо в лицо, дескать, "не туда, не в ту сторону и не в тех врагов вы стреляли, стреляли бы в противоположную сторону, в своих внутренних врагов, теперь мы все лучше жили бы..." Что это? Скорее всего, наивность, граничащая с безграмотностью, незнанием истории, цинизм и ограниченность людей или проделки отпрысков тех, кто потерпел поражение в той войне и кто жаждет реванша теперь. Но не повернуть историю вспять! Не в чем нас упрекать сегодня. Мы честно выполнили сыновний долг перед Родиной и горды своей Победой.

Пользуясь возможностью, поздравляю с праздником Победы дорогих коллег-преподавателей, сотрудников, студентов. А особенно всех тех, кто прошел через горнило войны, выдержал, выстоял и победил в той страшной войне.

***В. АТРЕЩЕНКОВ,***
***майор запаса, кандидат философских наук, доцент.***

# ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ

Праблемам, якія існуюць ужо дзесяцігоддзе пасля чарнобыльскай трагедыі, была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя, арганізаваная сумеснымі намаганнямі нашага універсітэта і хіміка-тэхналагічнага тэхнікума.

Аб радыяцыі, дозах і выніках апраменьвання падрабязна і даходліва расказала дацэнт нашага універсітэта С.С. Маглыш. Пра спадчынную і прыродную паталогію ў Гродзенскай вобласці да чарнобыльскай аварыі і пасля яе гаварыла дацэнт Г.І. Індушка. Цікавым было выступленне Т.М. Зямсковай (хіміка-тэхналагічны тэхнікум) пра ўплыў чарнобыльскай аварыі на здароўе дзяцей, у прыватнасці, нашых, гродзенскіх.

"Біяхімічны след у арганізме жывёл пасля ўнутранага апраменьвання радыёактыўнымі ёдам і цэзіем" - тэма выступлення дацэнта К.А. Мандрыка. Аб утрыманні радыёнуклідаў у сельскагаспадарчых прадуктах нашага рэгёна расказала студэнтка хіміка-тэхналагічнага тэхнікума Вольга Бялецкая.

Нібы падводзячы рысу сказанаму, грунтоўна спыніўся на актуальных праблемах аховы навакольнага асяроддзя і здароўя насельніцтва Беларусі прафесар медыцынскага інстытута М.С. Амельянчык.

*С. ІВАНОВА.*



# БЫЎ МЕСЯЦ МАЙ...

*(Пачатак на 1-й стар.)*

Вось запіс ад 16 мая 1945 года:

*Вчера, впервые за долгие годы, справлял свои именины, 21 год жизни. Лучшие из них отданы борьбе с немецкими захватчиками, делу Победы. Эти годы закалили меня, став годами испытаний в борьбе суровой и смертельной... Я преодолел смерть,*



*познал всю прозу суровой военной жизни и никогда не терял присутствия духа.*

*Вспоминаю свои 17 лет: будущее полно надежд, рядом друзья. Счастливое время - май 41-го. Через год - 18-летие: дни войны, истребительный батальон, горечь эвакуации, далекая Тавда на Урале, работа в колхозе, затем военный завод, жаркая громыхающая кузница. Работа тяжелая, грязная, но почетная от сознания того, что в грозные минуты, когда враг подходит к Москве и Ленинграду, стоишь у молота и куешь инструмент для боевых машин... Затем училище, суровая воинская дисциплина, напряженная 12-часовая учеба: ни одной прочитанной художественной книги, ни одной отвлеченной мечты - все для овладения в короткий, полугодичный срок военной специальностью. И гордость от того, что не пропало даром юношеское увлечение спортом... Государственные экзамены - кругом на "отлично" и вот уже громкое звучное звание - лейтенант.*

*15 мая 1943 года. 19 лет. Дорога на фронт, теплушки, расспрашиваем "бывалых" о немцах, о фронте. Буйная, бесшабашная, девятнадцатилетняя вольница, готовая грудью идти на пулемет, свернуть горы, раздавить врага... Украина. Весна. Дорога на фронт, знойная и песчаная, повсюду - подбитые машины, обгоревшие пушки и танки, дырявые немецкие каски, одинокие могилки вдоль дороги, в лесу, на опушках. 300 км пешком, на автомашинах и танках. А вот и передовая линия фронта - Северный Донец, окровавленный, вспенившийся, с плавающими разбухшими трупами, с берегами, испещренными окопами, траншеями, опутанными колючей проволокой, начиненными минами, с иссеченным, израненным лесом, земля в котором сплошь покрыта слоем осколков, взрывателей, пропахла дымом и кровью. Немцы - в 40-50 метрах. Неумолкающая перестрелка, уханье мин, чечетка пулеметов, переливчатая дробь автоматов. Игра "катюш" - ободряющая, поддерживающая дух. Мое подразделение - взвод, 23 человека, их судьбы и жизни. Линия обороны - 1,5 км. Как не вяжется: волнующие майские ночи и война, вражеские разведки, попытки переправы, людские потери. При отражении очередной контратаки погиб лучший друг - Валерий Кулагин...*

Толькі той, хто паспытаў самае пекла вайны, хто зведаў моц атакі і горыч адступлення - агонь, дым, кроў, смерць, боль і тую звышчалавечную сілу, што кідала ў бой і не давала скарыцца, толькі той ведае, што такое сапраўдная вайна. Як успамінае Якаў Ісакавіч, днём было трохі перадышкі: пад спякотлівым сонцам, не шкадуючы рук, акопваліся, ноччу ішлі на лінію абароны. А паколькі сілы былі далёка няроўныя, яшчэ прыходзілася і рабіць выгляд, што ў абароне іх, савецкіх салдат, больш, чым на самой справе. Радзелі абарончыя падраздзяленні, папаўнення нейкі час не было. Дзён 10 трымаліся, перайшоўшы Данец, у напрамку Данбаса. Тыя 10 дзён увабралі ў сабе ўсе чорныя фарбы вайны. А ў адзін з такіх спякотлівых дзён, адбіваючы контратаку немцаў, камандзір стралковай роты Будоўскі быў цяжка паранены. Пасведчанне, выдадзенае 19-гадоваму лейтэнанту, залітае крывёю, ён захоўвае і сёння.

З дзённіка:

*57-я ударная стрелковая дивизия, направление главного удара, ожесточенные кровопролитные бои. Вышиблен из строя на седьмой день после приказа о наступлении: тяжелая смертельная рана в груди, контузия, госпиталь. В 44-м открылась рана, опять плеврит, малярия. Мечтал о победе, думал о дорогах Германии, а стал инвалидом.*

У баявы строй ён ужо не вярнуўся. Пасля шпіталя працаваў намеснікам дырэктара рамеснага вучылішча на Урале. У Дзень Перамогі, такі доўгачаканы, некалькі разоў браў у рукі дзённік. Успамінаў перажытае, зноў і зноў вяртаючыся да тых страшэнных дзён.

Запіс у дзённіку 9 мая 1945 года:

*Сегодня день, который запомнится на всю мою жизнь. Покоробленный войной, я сегодня счастлив, как никогда...*

Вайна параніла не толькі грудзі, але і душу. Прыгожы, высокі, разумны і - інвалід. Адчуванне гэта не давала спакою. Заняўся спортам. Вярнуўся ў лёгкую атлетыку, дасягнуў нават лепшых вынікаў, чым да вайны. І вось ужо адчуў сваю перавагу над немаччу.

Старонка з дзённіка (чэрвень 45-га):

*Многие из вас, молодых, смотрят на нас (инвалидов) с умышленной жалостью. Но не нужна нам жалость, мы презираем людей, жалеющих нас, считающих нас обломками, ибо испытания и страдания не только не сломили нас, а наоборот, закалили. Инвалид от войны - это уже не то понятие об инвалиде, человеке отжившем и конченном, ни на что больше не способном. Как измятый, поломанный репейник, воля к жизни которого воспета Л. Толстым, инвалид войны выпрямляется, снова растет с силой и жаждой человека, познавшего когти смерти, тянется к жизни, к солнцу, к заслуженному, завоеванному, кровью орошенному счастью...*

Далей - вучоба ў Ленінградзе, праца ў Гродне. Школа для сляпых дзяцей, якой ён аддаў увесь запал свайго сэрца, юнацкі максімалізм і шчырае жаданне дапамагчы, стаяла ў тыя пяцідзесятыя гады якраз на гэтым месцы, дзе зараз новая дабудова галоўнага корпуса універсітэта. 30 гадоў працуе Якаў Ісакавіч у нашай вну. Да высокіх ваенных узнагарод прыбавіліся мірныя. Ён - выдатнік народнай асветы. Міністэрства адзначыла яго ўклад у выхаванне і навучанне ганаровым знакам вышэйшай школы СССР "За выдатныя поспехі ў працы". Ён кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Наогул, чалавек разнастайных захапленняў. Больш як 50 гадоў збірае крылатыя выразы, піша шмат вершаў, захапляецца драўлянай скульптурай. Дзённікі, напісаныя ім у маладыя і больш сталыя гады, маглі б паслужыць выдатным матэрыялам для вялікага псіхалагічнага рамана. У ім - станаўленне чалавека - творцы, шлях праз вайну, вялікае і прыгожае каханне, пранесенае праз усё жыццё...

У мінулым маі, у 50-годдзе Вялікай Перамогі, Якаў Ісакавіч ізноў блізка дакрануўся да падзей вайны, многае перажыў нанава, сустрэўшыся ў Маскве з ветэранамі 1-й Гвардзейскай Арміі. З усіх куткоў былога Саюза іх сабралася 60 чалавек, нягледзячы на межы, матэрыяльнае становішча, хваробы. Ім было што ўспомніць...

*С. МУРЫНА.*

***На здымках: Я. Будоўскі пасля шпіталя, у 1944 годзе; амаль праз паўстагоддзя сустрэліся ў Чарнігаве былыя камандзіры рот. Я.І.Будоўскі - на здымку злева.***





**Выставы**

# ЧЫСЦІНЯ КОЛЕРУ, ПРАПОРЦЫЙ, ПРАСТОРЫ

Творчая атмасфера панавала ў аўдыторыях і майстэрнях. Студэнты і выкладчыкі кафедры выяўленчага мастацтва рыхтаваліся да адкрыцця выставы, прысвечанай Дням факультэта. Выбар студэнцкіх работ суправаджаўся сяброўскай дыскусіяй. Нарэшце ўсе падрыхтаванні скончаны - экспазіцыя аформлена.

Выстава не засталася незаўважанай. Сярод гледачоў - вялікая колькасць студэнтаў і выкладчыкаў. Здымала яе абласное тэлебачанне.

Выстава прадстаўляе сабой шматкаляровую калейдаскапічную карціну. На ёй разнастайныя па жанравасці і па тэхніцы выканання работы. Студэнтамі спецыяльнасцяў "Выяўленчае мастацтва і чарчэнне" і "Педагогіка і методыка пачатковага навучання і выяўленчае мастацтва" створаны нацюрморты, партрэты, краявіды, сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі. Усе работы, як і іх аўтары, індывідуальныя, кожная вырашае свае задачы. Імкненне знайсці і перадаць нязвыклае ў звычайным, цудоўнае ў простым, выкарыстанне максімальна выразных магчымасцяў матэрыялу, праяўленне цікавасці да праблем колеру і формы - вось толькі невялікі схематычны пералік мэтаў і стану, якія імкнуліся перадаць у сваіх работах студэнты.

Але ва ўсіх творчых пошуках студэнтаў-мастакоў чытаецца агульная сугучнасць, і, калі паспрабаваць вызначыць, у чым яна заключаецца, то я назвала б гэта імкненнем да сапраўднага прафесіяналізму.

На выставе няма безаблічных, пазбаўленых густу работ, кожная па свойму цікавая і дзівосная.

Дастаткова ўважліва пагледзець, напрыклад, работу Фёдаравай Г. (ІІ к., кіраўнік Бурчык А.І.). Нацюрморт уключае ў сабе звыклыя прадметы: керамічны збанок, муляж бурака, некалькі розных па колеру драпіровак і гронкі чырвонай рабіны. Работа прываблівае сваёй маляўнічасцю, багаццем колеру і яго найтанчэйшымі адценнямі, удала знойдзеным гарманічным агульным тонам. Аўтару ўласціва жывапіснае бачанне свету. Колер успрымаецца прыгожа - радасна. Студэнтка падыходзіць да сапраўды творчага бачання, свабоднага і раскаванага звяртання з прадметнай формай і прасторай.

Работы Кіркіцкай Л. (кіраўнік Бурчык А.І.) з агульнай назвай "Поры года" даюць поўны прастор фантазіі, колераваму і прастораваму ўяўленню. Плаўнае чаргаванне і наяўнасць адных і тых жа колеравых спалучэнняў, узнікаючых на розных планах, уласціва дэкаратыўнаму рашэнню тэмы.

У невялікім па фармату нацюрморце, выкананым алоўкам, студэнткі 4 курса Касцевіч Н. (кіраўнік Ляшчынскі А.А.) аб'ёмныя формы стылізаваны ў плоскасныя геаметрычныя і выкананы ў дэкаратыўна-плоскаснай манеры. У рабоце вырашаюцца не толькі задачы пераводу аб'ёму ў плоскаснае адлюстраванне, але і рытмічная арганізацыя ліста як адзінага цэлага.

Складанасць праблемы актывізуе творчыя сілы студэнта, дае прастору фантазіі ў пабудаванні кампазіцыі.

Тэматычная кампазіцыя Кандрашук А. ( ІІ к., кіраўнік Асапрылка С.Т. ) прываблівае не толькі правільна знойдзенай танальнасцю і адценнямі колеру, але і яе арганізацыяй на фармаце. Адлюстраванне, зробленае студэнткай, як бы траціць матэрыяльнасць і ўспрымаецца як чаргаванні светлых і больш цёмных адценняў, якія ў сваіх сутыкненнях арганізуюць прасторавую структуру кампазіцыі.

Тэма, якая закранута ў кампазіцыі студэнткі 3 курса Алейнікавай В. (кіраўнік Бандарчук М.Т.), спыняецца на магічным перасячэнні вертыкалі і гарызанталі.

Крыж - гэта сімвал не столькі рэлігіі, колькі формула, выяўляючая здзіўленне чалавека перад таінствам сусвету. Вертыкаль - сімвал накіраванасці ў космас, сувязь з космасам, гарызанталь - заземленне. Адзінства іх - крыж - абазначэнне прыхільнасці нашага цела да зямлі і накіраванасць духу ўвысь.

Цікавыя вучэбныя нацюрморты (малюнак) студэнтак Емельянавай А, Пархуты І. (І курс, кіраўнік Урублеўскі П.Б.); графічныя работы, выкананыя тушшу Наній А. (3 курс, "Нацюрморт", кіраўнік Бурчык А.І.), Гарынец А. (4 курс, кіраўнік Бандарчук М.Т.); лінагравюра Ясьскова А. (кіраўнік Урублеўскі П.Б.); работы, выкананыя ў змешанай тэхніцы Міхайлавай В.П. (3 курс, кіраўнік Бурчык А.І.) і Касцевіч Н. (4 курс, кіраўнік Ляшчынскі А.А.), вацінянкі "Калядны" студэнткі Зіноўкі В.

Шлях раскрыцця творчых здольнасцяў студэнтаў-мастакоў ідзе ад жадання працаваць, рэалізаваць прыродныя здольнасці, асэнсавання свайго таленту і магчымасцяў і, нарэшце, прыводзіць да асабістага самавыяўлення ў мастацтве.

Пры цяперашнім хаатычным успрыняцці рэальнасці, сусвету творчы пошук студэнтаў выглядае асабліва прывабна. Работы сцвярджаюць не толькі выяўленчую грамату мастацтва, але і імкненне да чысціні колеру, прапорцый, прасторы...

*А. БРАКАЛА,*
***Выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва.***

# СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ

Далікатныя сціплыя вяночкі, пакладзеныя гладдзю на палатно, быццам увабраўшыя хараство сонечнага луга, нечаму нагадваюць дзяцінства, асацыіруюцца з перадсвяточнай белізной сурвэтак, занавесак. Нельга не заглядзецца на пано, вышыванае крыжыкам на канве. Быццам рэліквіі з сямейнага куфэрка - вышыванкі, аздобленыя мярэжкай, карункамі. Над усімі гэтымі прыгожымі рэчамі ні адзін доўгі вечар цярпліва, радок за радком выконваючы малюнак, працавала Ганна Серафімаўна Сідарчук. У Дні навукі і творчасці факультэта яе вышыванкі ўпрыгожылі выставу, дзе прадстаўлены свет захапленняў многіх выкладчыкаў факультэта псіхалогіі і педагогікі.

Якаў Ісакавіч Будоўскі прадставіў цэлую галерэю драўлянай скульптуры, вырабаў з іншых прыродных матэрыялаў. Знайшоўшы і сабраўшы галінкі, карэньчыкі, адросткі, ён любоўна апрацаваў іх, скампанаваў, надаў вобраз і вось цуда гэта - ва ўсёй сваёй прыгажосці, а побач - прывабныя, нават нейкія вытанчаныя, адмысловыя драўляныя прадметы побыту, таксама зробленыя рукамі майстра. Побач - некалькі малюнкаў, пейзажы Валянціны Паўлаўны Міхайлавай - кавалачак родных краявідаў, дарагіх сэрцу. Побач - выразныя кампазіцыі з засушаных кветак і галінак. Другое жыццё ім дала Вера Антонаўна Місцюк. Ад вырабаў са скуры, выкананых Любоўю Дзмітрыеўнай Шнітко, не адмовілася б ні адна прыгажуня: тонкая работа, арыгінальныя рэчы.

Даволі цікавая і змястоўная калекцыя значкоў прадстаўлена на выставу Таццянай Міхайлаўнай Прудко. Тут і героі народных былін, і рускія палкаводцы, і "карэбельная" галерэя, і сучасныя тэмы і матывы значкістыкі.

Некалькі незвычайныя для выставы экспанаты прадставіў Мікалай Пятровіч Чарнякевіч. Відаць, заўзяты агароднік, садавод, кветкавод, ён сабраў насенне рэдкіх дэкаратыўных раслін, апісанне іх, каштоўную літаратуру і вось ён, свет захапленняў, адразу адчуваецца і відаць. А яшчэ на адну паліцу Мікалай Пятровіч змясціў любімыя кніжкі, паэтычныя зборнікі, напэўна, дарагія яго сэрцу.

# ВЕЧАР РАМАНСА

Сапраўдную асалоду атрымалі ўсе, хто прыйшоў у адзін з красавіцкіх вечароў на справаздачны канцэрт выхаванцаў старшай выкладчыцы кафедры харавога дырыжавання і вакалу Лілії Іванаўны Дзюбінай, чыім голасам, дарэчы, захапляліся слухачы не толькі ў нашым горадзе. Не так даўно апладзіравалі ёй і за мяжой. Яна не толькі таленавітая спявачка, але і выдатны педагог. Вечар рамансa яшчэ раз падкрэсліў гэту акалічнасць, дазволіў убачыць юныя таленты, якія робяць свае самастойныя крокі ў выканаўчым майстэрстве пад яе кіраўніцтвам, пры яе ўдзеле.

Чыстыя звонкія галасы Л.І. Дзюбінай і студэнткі 2-га курса Ірыны Міхалёвай удала спалучаліся ў дуэце Лізы і Паліны з оперы Чайкоўскага "Пікавая дама". Гэтым нумарам і распачаўся канцэрт. Пасля голасам студэнткі ІІ курса Алены Быстровай, быццам імклівы веснавы ручай, прагучала "Вясна" Чайкоўскага. Яе зноў на імправізаванай сцэне змяніла Лілія Дзюбіна і зала запоўнілася нясцерпным болем адчаю ад настальгічнага і такога знаёмага нам твора Чайкоўскага "Расчыніў я акно". Быццам новы змест набылі ясенінскія "Зоркі", сталі яшчэ больш патаемнымі і недасягальнымі ў выкананні трэцякурсніцы Эльвіры Кулікоўскай. Сапраўды руская заўзятасць чулася ў голасе першакурсніцы Наталлі Стрыжаковай: у яе выкананні прагучала "Тройка" Булахава. Не толькі добрым голасам, але і абаяльнай усмешкай парадаваў слухачоў трэцякурснік Яўген Альфяровіч. Ён даў магчымасць атрымаць задавальненне ад добра знаёмых твораў "Сярод шумнага балю" Чайкоўскага і "Не цалуй мяне" Варламава.

Прыемнае ўражанне пакінулі таксама маладыя выканаўцы Таццяна Шырко, Марына Лісай, Наталля Сіманец, Таццяна Каспяровіч, Наталля Бобчык, Юлія Нікалаенкава.

# ПАЛЁТЫ Ў СНЕ ЦІ... НАЯВЕ

Тры мерапрыемствы на факультэце псіхалогіі і педагогікі наведала я ў той красавіцкі дзень. Прыемна здзівіла выстава, асалоду атрымала ад рамансa. Аднак наймацнейшы штуршок надзвычай новых пачуццяў і адчуванняў атрымала, стаўшы ўдзельніцай псіхалагічнага трэнінгу, які праводзіла ст. выкладчыца факультэта Надзея Іванаўна Родзік. Разам з ёю мы спрабавалі ўваходзіць у кантакт з асабістай падсвядомасцю, праз нескладаныя практыкаванні вучыліся знаходзіць месцы пазітыўнага вопыту ў сваім мінулым, каб унесці іх у іншыя адрэзкі жыцця, вучыліся "падсілкоўвацца" станоўчай (пазітыўнай) энергіяй, спрабавалі судакрануцца з любячай часткай самога сябе... Містыка? Спяшаюся запярэчыць скептыкам. Нам, "замардаваным" сёння маральна і фізічна, у роспачы жыцця так не хапае якраз той самай любові да сябе, адчуць якую і спасцігнуць нам дапамагала Надзея Іванаўна. Але гэта - тэма для асобнай - цікавай і супярэчлівай размовы.

*С. БЕРАСТ.*



**На Савеце універсітэта**

# НАВУКА: УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

Савет універсітэта на адным са сваіх апошніх пасяджэнняў заслухаў справаздачу прарэктара па навуцы С.А. Маскевіча "Аб стане і перспектывах укаранення ў вытворчасць і навучальны працэс вынікаў навукова-даследчых распрацовак". Быў прааналізаваны даволі працяглы адрэзак часу (пачынаючы з 80-х гадоў), на якім акрэсліліся напрамкі навуковай дзейнасці універсітэта, удасканальваліся формы і метады гэтай працы.

У мінулым годзе ва універсітэце, маючым ужо пэўны вопыт навукова-даследчай працы, пачало дзейнічаць "Палажэнне аб укараненні і выкарыстанні вынікаў НДР", што спрыяе развіццю навукі і выкарыстанню яе ў вытворчасці і навучальным працэсе.

Летась на прадпрыемствах і ва ўстановах укаранёна 10 грунтоўных тэмаў. Дзве з іх распрацавана на факультэце біялогіі і экалогіі. У выніку плённай працы навукоўцаў на прадпрыемстве "Біягель" выраблена партыя комплекснага біягеннага жалезаўтрымліваючага прэпарата "Біяфер", а ў калгасах Гродзенскай вобласці выкарыстаны гарманальныя прэпараты, атрыманыя дзякуючы распрацоўкам нашых вучоных. На Лідскім прадпрыемстве "Оптык" знайшлі ўкараненне дзве распрацоўкі нашых фізікаў. На гуманітарных факультэтах ёсць укараненне вынікаў НДР у педагагічны працэс школ, вучылішчаў, дзіцячых садкоў горада і вобласці. На факультэце права і эканомікі ёсць удалыя спробы ўкаранення ў органы юрыспрудэнцыі навуковых напрацовак па праблемах умацавання правапарадку, па ўдасканаленню і сістэматызацыі заканадаўства рэспублікі.

Як сведчаць справаздачы кафедраў і факультэтаў універсітэта, у мінулым годзе ўкаранёна ў вучэбна-выхаваўчы працэс больш як 150 навукова-даследчых распрацовак, якія зрабілі больш змястоўнымі і дасканалымі тэмы курсаў, спецкурсаў, спецсемінараў, курсавыя і дыпломныя работы.

На Савеце універсітэта таксама вялася размова аб праблемах укаранення ў вытворчасць і навучальны працэс вынікаў НДР, аб перспектывах гэтай працы.

*С. БЕРАСТ.*

# БУДЗЕ ПРАГРАМА ІНАВАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ

Не сакрэт, што эканамічная сітуацыя ў нашай рэспубліцы характарызуецца як вельмі складаная. На мікраўзроўні найбольш злабадзённыя зараз дзве праблемы: забеспячэнне прадпрыемстваў матэрыяламі, сыравінай, энергарэсурсамі і пашырэнне рынка збыту прадукцыі. Як ніколі раней, наша прамысловасць сёння мае патрэбу ў прыцягненні і ўкараненні інавацыйных рэсурсаў. У сувязі з гэтым аддзелам праблем рэсурсазберагання АНБ, Гродзенскім універсітэтам, мединстытутам, сельгасінстытутам, інстытутам біяхіміі АНБ, адказнымі службамі аблвыканкама падрыхтаваны праект для дзяржаўнага заказу: распрацаваць канцэпцыю і праграму інавацыйнага развіцця прамысловасці Гродзенскага рэгіёна.

Прадстаіць вялікая грунтоўная праца ў некалькі этапаў: вывучэнне рэсурснага, эканамічнага і інавацыйнага патэнцыялу рэгіёна, вывучэнне і аналіз замежнага вопыту, вызначэнне прыярытэтных напрамкаў развіцця эканомікі рэгіёна, мадэляванне яго інавацыйнай структуры, стварэнне канцэпцыі інавацыйнага развіцця рэгіёна і праекта праграмы рэалізацыі гэтай канцэпцыі. Праца будзе доўжыцца ў бягучым годзе і да канца наступнага. У ёй прымуць удзел выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта В.В. Сянько, Лі Чон Ку, А.Ф. Бадзюкоў, К.П. Кротаў, Ф.Б. Марголін, А.Л. Белавусаў і іншыя.

*С. ІВАНОВА.*

# ПОИСК ПОМОГАЕТ УЧЕБЕ

Общий процесс эволюции высшего образования направлен от книжно-письменных форм обучения к "деятельным", от приобретения "учености" в форме пассивных знаний к овладению материальными и духовными средствами практической работы. В целом же система практической подготовки должна вооружать студента фундаментальными и специальными знаниями, умениями и навыками, прививать профессиональное мышление и широкий кругозор, обеспечивать возможность смелого творческого поиска, формировать его как социально активную личность. Решить эти задачи во многом помогает приобщение студентов к научно-исследовательской работе. А это возможно лишь в тех случаях, когда научная работа ведется активно на всех кафедрах вуза, и если научные исследования являются многоплановыми.

На факультете биологии и экологии основными научными направлениями в организации НИР являются экология и фармакология. Несмотря на незначительную численность профессорско-преподавательского состава, наиболее активно научная работа ведется на кафедре ботаники и зоологии. В последнее время научные разработки ведутся по следующим направлениям:

-экологический мониторинг окружающей среды и разработка мероприятий по улучшению ее состояния в Западном регионе Беларуси;

- исследование и разработка пролонгированных гормональных и биогенных железосодержащих препаратов;

- почва, кормовые растения и сельскохозяйственные животные как биоиндикаторы загрязнения окружающей среды токсичными металлами;

- влияние промышленных выбросов и урбанопрессинга на энтомофауну г. Гродно;

- оценка видового разнообразия и популяционной изменчивости животных в зависимости от мозаичности ландшафтов и типа экотипов;

- оценка состояния сокращающихся популяций земноводных и др.

В результате приобщения студентов к выполнению научно-исследовательских работ по вышеуказанным и другим темам на кафедре ежегодно выполняется и защищается более 20-ти курсовых и более 10-ти дипломных работ. Сотрудники кафедры ежегодно публикуют 8-13 научных статей, за последние 3 года защищено 3 кандидатских диссертации, подано 6 заявок на изобретения, которые уже прошли предварительную экспертизу с положительной оценкой в Белорусском патентном ведомстве.

В период практической подготовки студентов и специализации особую остроту приобретает вопрос учить ли всему "понемногу" или "помногу" - чему-то одному. Обе модели обучения обладают достоинствами и недостатками, они отрабатывались и конкурировали в истории высшей школы. По нашему мнению, и та и другая должны сочетаться. Действительно, узкая специализация может оказаться губительной для молодого специалиста, сужение кругозора студента грозит ему в дальнейшем отставанием от научного прогресса. Молодой специалист не увидит и не поймет нового, зарождающегося на стыке его специальности и смежных областей знания. С другой стороны, не подключив студента к решению реальных научных, производственных проблем хотя бы на III курсе, вуз лишает его учебную работу серьезной деятельностной мотивации, рискует выпустить поверхностных специалистов. Вот почему в более выгодном положении оказываются те студенты, которые получают знания по разным дисциплинам, если они ведут активную научно-исследовательскую работу.

Уместно отметить, что и авторитет кафедры, факультета, да и вуза в целом, в основном, зависит не от того, сколько получили студенты неудовлетворительных, хороших или отличных оценок, а от того, на каком уровне и с какими результатами ведется здесь научно-исследовательская работа, формирующая у студентов знания и расширяющая их научный кругозор. Оптимальные результаты обеспечивает овладение основами знаний в сочетании с научной специализацией. Получив фундаментальную подготовку, выпускники вуза, придя на место работы, углубленно занимаются своим делом, понимают язык смежных областей, становятся специалистами, опираясь на преимущества фундаментальной подготовки, благодаря раннему приобщению к научному поиску новых нестандартных решений, особенно часто возникающих в настоящее время.

***Е. КРЕМЛЕВ,***
***зав. кафедрой ботаники и зоологии, профессор.***

## АДНАЎЛЯЕ РАБОТУ

жаночы савет універсітэта. Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне. Прааналізавана ўсё тое станоўчае, што зроблена жансаветам у мінулыя гады. Абмеркаванне паказала, што справа гэта патрэбная, карысная, а калі ўзяцца за яе з энтузіязмам, то і вынік будзе відавочным.

У склад жансавета абраны: Л.У. Кірылюк, М.І. Каралёва, В.С. Багаслоўская, Г.М. Шчальбаніна, Л.У. Бярэйшык, С.А. Філатава, Г.Ф. Лякова, Ф.С. Ляльчук, С.І. Мурына і іншыя.

Жаночы савет універсітэта, як і раней, будзе ўзначальваць Т.А. Бадзюкова.

*Наш карэспандэнт.*



ПАМЯЦІ АЛЯКСЕЯ КАРПЮКА

# "МАЯ ДУМКА - МАЁ СУМЛЕННЕ"

*У гэтым красавіку, такім нязвыкла-снежным, мы маглі адзначыць 76-годдзе нашага земляка, выпускніка педінстытута, пісьменніка і сумленнага чалавека Аляксея Нічыпаравіча Карпюка. Але не наканавана было яму напісаць новыя кнігі, выпеставаць новых паэтаў і празаікаў, радавацца, гледзячы, як падрастаюць унукі. Занадта рана ён пайшоў ад нас, але след, што пакінуў на зямлі,- застаўся. І ў людскіх сэрцах памяць аб ім жыць будзе яшчэ доўгія гады. Слова паэтцы Алене Руцкай.*

Вельмі слушна сказана, што ў сапраўдных творцаў ёсць толькі дата нараджэння, а даты смерці няма, бо яны несмяротныя, як зямля, якой яны служылі.

Аддана, самаахвярна служыў сваёй Бацькаўшчыне і Аляксей Карпюк, абраўшы сваім жыццёвым крэда словы Адама Міцкевіча : "Паэт не мае права быць шчаслівейшым за свой народ".

Я ўпершыню пачула яго імя ў школе. Мы любілі нашу настаўніцу беларускай мовы, любілі найбольш за "лірычныя адступленні", калі, забыўшыся на тэму і мэту ўрока, зачапіўшыся за нейкую, адной ёй бачную асацыяцыю, яна пачынала расказваць пра новы прачытаны твор, пра пісьменнікаў. У той дзень на ўрок пайшло хвілін пяць, а астатні час - на расказ пра сустрэчу з Аляксеем Карпюком. І на апошнім уроку я ўжо праз шчыліну ў парце чытала атрыманую з рук настаўніцы аповесць "Данута". Героі аповесці, жывыя, індывідуальныя, з унутранай годнасцю, рэзка кантраставалі з "тыповымі ў тыповых абставінах", як кантраставаў жывы чалавечы твар з шаблонна мэтанакіраванымі патрыётамі з плакатаў. Так пасялілася ў маёй душы патаемная выснова: праграмнае - гэта тое, што патрабуюць, а што неабходна прачытаць - трэба шукаць самой. Думаю, дзякуючы гэтаму і адчыніўся перада мною шырокі свет беларускай літаратуры.

А самога Аляксея Нічыпаравіча пабачыла я дзесьці праз дзесяць гадоў на пісьменніцкім з'ездзе.

Парадна і гладка прайшла першая палова дня. На чарговым перапынку ў кулуарах ішлі вострыя і куды цікавейшыя размовы. Званок нагадаў, што трэба вяртацца ў залу. "А можа, збяжым?" - прапанаваў Міхась Стральцоў сваім суразмоўцам. "Не, - адказаў нехта, - давайце яшчэ паслухаем Карпюка, а ўжо пасля збяжым." Далей пайшлі ўспаміны пра яго выступленне на V з'ездзе, пасля якога пісьменнік стаў персонай нон грата.

Памятаю, як замерла зала, калі годна і ўпэўнена стаў узыходзіць на сцэну высокі, цёмнавалосы мужчына, з горка-іранічнымі зморшчынкамі ля вуснаў і пранiклівым позіркам выразных вачэй. І ўсе яшчэ раз пераканаліся, што Карпюк не мяняў сваіх пазіцый, не здраджваў сваім перакананням, не знікла ў ім "прыродная рыса не ісці наперакор сваймy сумленню". Гэта не значыць, што яго нельга было пераканаць у памылковасці поглядаў, у тым, у чым ён не меў рацыі. Наадварот, ён не ўхваляў, як сам вызначаў, "дзеравяных". Але яшчэ больш не любіў "флюгераў". Ніколі ім не змоўчваў, і не толькі тады, калі справа тычылася яго, а, відаць, нават у большай ступені, калі такія двудушнікі абражалі яго сяброў. За блізкіх яму было балюча яшчэ больш. Прыгадваецца, як у Слоніме, на юбілеі (75-годдзі) паэта Анатоля Іверса, якога незаконна абвінавацілі ў супрацоўніцтве з немцамі, а ён быў адным з кіраўнікоў падполля, 20 год заціралі, не друкавалі, Карпюк сказаў, маючы на ўвазе такіх пярэваратняў: "Ім ужо не хопіць яго юбілеяў, каб выпрасіць прабачэнне за тое, што так яго тапталі".

Калі Аляксей Нічыпаравіч узначаліў Гродзенскае абласное аддзяленне СП, сустракаліся мы часта. Ён меў выдатны арганізатарскі талент, стараўся пашырыць кола нашых творчых сувязей, запрашаў літаратараў з Літвы, Беласточчыны, Украіны, ладзіў сустрэчы з чытачамі. Ён умеў захапіць аўдыторыю, умеў весці дыялог. Але, выступаючы з кім-небудзь, найменш клапаціўся пра сябе, непрыхавана перажываў за ўсіх.

Аднойчы праходзіла сустрэча з настаўнікамі ў інстытуце ўдасканалення. Я вельмі хвалявалася. Па-першае, перад калегамі, па-другое, з такім прызнаным майстрам слова. Аляксею Нічыпаравічу першаму далі слова. Ён пажартаваў: "Я ведаю, што вы кіруецеся праверанымі прынцыпам: празаіку трэба даваць слова першаму - ён задурыць слухачоў і заваліць сустрэчу, а паэту трэба даваць слова апошняму - ён натхніць публіку і ўратуе мерапрыемства. І ўсё ж мы парушым гэты прынцып. Ды і як я буду выглядаць, калі не прапушчу наперад жанчыну".

Зала смяялася, напружанне знялося, і мне было лёгка выступаць, адчуваючы прыхільнасць слухачоў.

Аляксей Нічыпаравіч умеў радавацца чужым поспехам, шчыра і сардэчна. Часта ўспамінаю нашу перадапошнюю сустрэчу. Мы вярталіся пасля нарады пехатой па вуліцы Горкага. Да самага гатэля Аляксей Нічыпаравіч хваліў мне падборку вершаў М. Дуксы ў "Полымі", пералічваў усё, што яму спадабалася з надрукаванага ў апошні час нашымі агульнымі знаёмымі. "Зараз павінна з'явіцца многа цікавага, калі і ў путах напісана, што не ганьба свету паказаць, то цяпер... Трэба пісаць, столькі ж трэба ўзняць. Цаліна мінулага, цаліна наперадзе. Прыйшоў час"... - сказаў, развітваючыся.

Так. Тады прыйшоў час. Але вельмі мала выдзеліў ён майстру. Засталася памяць, творы і запавет: "Калі мы кажам, што літаратура павінна вучыць людзей, то вучыць павінна мужнасці".

***Алена РУЦКАЯ,***
***член Саюза пісьменнікаў Беларусі, ст. выкладчык кафедры беларускай літаратуры.***

---

# ЗА РАДКОМ АЎТОГРАФА...

***Ужо больш года прайшло, як не стала Сямёна Аляксандравіча Грыгор'ева, выдатнага вучонага, настаўніка, інтэлігента вышэйшай пробы. Светлая памяць аб ім заўсёды будзе жыць у сэрцах яго саратнікаў, вучняў і паслядоўнікаў.***

Родныя Сямёна Аляксандравіча перадалі універсітэту яго вялікую бібліятэку.

...Рэчы, якія застаюцца пасля чалавека, могуць сказаць вельмі многае аб ім, яго характары, звычках, захапленнях. І асабліва кнігі...

Мне прыйшлося разбіраць бібліятэку Грыгор'ева. І вось, перабіраючы кнігі, я адчула, што не магу спакойна пакласці іх на паліцу. Мяне не пакідала пачуццё дачынення да нечага незвычайнага. Перада мною паўстала постаць чалавека неардынарнага, высокаадукаванага, таленавітага, чалавека рознабаковых інтарэсаў і захапленняў.

Навуковыя манаграфіі па рускай, беларускай, польскай, нямецкай філалогіі, разнастайныя слоўнікі, мастацкая і навуковапапулярная літаратура. Сярод іх сустрэліся і рэдкія выданні. Гэта і чатырохтомны "Словарь украинского языка", выдадзены ў 1907 годзе ў Кіеве, і "Лекции по истории русского языка" 1907 года выдання, і выдадзеная ў Вільнюсе кніга Антановіча А. "Белорусские тексты, писанные арабским письмом".

Асаблівую ўвагу прыцягнула кніга французскага вучонага А. Мейе "Введение в сравнительную грамматику индо-европейских языков" 1911 года выдання, з кітайскай этыкеткай, надпісам: "На память о Мейе, о Китае и обо мне" і подпісам па-кітайску.

Наогул мяне зацікавілі надпісы і кнігі з аўтографамі. Вось толькі некаторыя з іх.

На многіх кнігах надпісы "З глыбокай павагай", "З пажаданнямі ўсяго найлепшага", "З удзячнасцю за парады і дапамогу" і аўтарскія подпісы вядомых беларускіх мовазнаўцаў: Ф. Янкоўскага, М. Бірылы, А. Падлужнага, М. Булахава, А. Манаенкавай і інш. Аўтары чатырохтомнага Тураўскага слоўніка А. Крывіцкі, Г. Цыхун і І. Яшкін падаравалі сваю працу з надпісам: "На добры ўспамін пра вандроўкі па Палессю ў пошуках слоў".

Цэлую бібліятэчку складаюць кнігі (працы) выкладчыкаў нашага універсітэта І.Я. Лепешава, В.М. Нікіцевіча, Г.В. Нікіцевіча, Г.У. Ярмоленкі, Т. Ф. Сцяшковіч, М.А. Даніловіча і іншых з аўтарскімі надпісамі.

Дарылі свае кнігі Сямёну Аляксандравічу вядомы беларускі этнограф В. Бандарчык, крытык і літаратуразнаўца Дз. Бугаёў, пісьменнік Я. Брыль, а таксама вядомы рускі мовазнаўца, які ўнёс вялікі ўклад у развіццё беларускай дыялекталогіі і гісторыі беларускай мовы Рубэн Аванэсаў.

Шчырыя надпісы Галі Жылуновіч, дачкі пісьменніка, на кнігах Цішкі Гартнага "Нашым дарагім сябрам..." гавораць аб блізкіх, сяброўскіх адносінах з сям'ёю вядомага пісьменніка.

З хваляваннем брала я ў рукі кнігі з кранаючымі надпісамі: "Сыну от матушки", "...эту книгу, присланную мне в Клухари из солнечной Ферганы, передаю вам, сын. Из нее при свете коптилки я черпала материал для первых своих лекций в годы войны. Матушка. Ленинград. 1947 г."

На адной з кніг (дарэчы, таксама рэдкай, выдадзенай у 1935 г, В. Богородицкий "Общий курс русской грамматики") наступнае прысвячэнне:

Лишь Истина в твоей душе
Находит пусть приют удобный.
Науки подлинных мужей
Нет средь лжецов и им
подобных.
Как компас, в жизненном пути,
Как разрешительную визу
Возьми лишь совесть, чтоб идти
Всегда, везде с таким девизом:
Хочу прожить недаром век
(Коптеть бесплодно - вещь
простая)
И миссию: "Я - Человек",
Исполнив, в Космосе
растаять!..

З такім дэвізам і пражыў сваё светлае жыццё сапраўдны Чалавек - Сямён Аляксандравіч Грыгор'еў.

***Н. ЕМЯЛЬЯНЧЫК,***
***бібліятэкар.***



*Эхо войны*

# СКОРБНАЯ ЛЕСТНИЦА НА ЗАВЕРШИЗНУ

Этот пешеходный маршрут знают многие гродненцы. Благодаря ему можно за считанные минуты попасть из шумного центра города прямо на тихую Переселку. Самая живописная часть его - овраг, внизу которого, как и прежде, шумит впадающая в Неман Городничанка. Найти этот переход несложно. Достаточно только пройти несколько десятков шагов от кинотеатра "Гродно", мимо памятника маршалу Соколовскому, по дороге, убегающей вниз. Переход этот состоит из примитивной лестницы, сложенной из бордюрно-тротуарного крошева, настолько резко уносящей пешеходов вниз, что имеющиеся поручни из ржавых труб, кажутся архитектурным излишеством. Следующее испытание для пешеходов - деревянный, с выломанными ступеньками спуск, ведущий к гулкому мосту через речку. После этого начинается путь в гору, удивительно выигрывающий по сравнению с прежним неудобьем, благодаря чудесной лестнице из тяжелого тесаного камня, которая заканчивается уже на улице с красивым, но нетипичным названием - Завершизна!

Несмотря на естественную тяжесть подъема, об усталости не думаешь, а думаешь про то, как ладно и удобно она сработана. Лестница эта не пряма, а извилиста; шаг - нормальный, от марша к маршу - небольшой переход: не успел оглянуться - и уже наверху. Справа ее защищает сдерживающая грунт ступенчатая, из крупного камня стенка, вся увитая диким виноградом; выше ее - склон, поросший кустарниками и разнотравьем; слева - поражающий своей продуманностью и добротностью водосток; под ногами - массивные красноватые плиты, отшлифованные ногами прохожих и неумолимым временем. Его быструю текучесть как-то особенно остро ощущаешь наедине с природой, у крепостных стен, храма, на кладбище, и здесь - на лестнице. Мне она всегда казалась, особенно в молодости, старой-престарой, причем, не только ввиду явных архитектурных достоинств и мастерства людей, построивших ее, но и из-за этого глубоко щемящего чувства. А потому не однажды возникало желание дознаться об истории появления этого творения человеческих рук на свет. Стал наводить справки о лестнице в архивах, считая временем ее постройки XIX век или первые десятилетия XX-го (что тут говорить, при царе и за польским часом действительно умели строить). Однако поиски шли медленно, а затем из-за текучки и других дел вообще прекратились. И только совсем недавно, поднимаясь по привычному маршруту наверх, меня неожиданно осенило, а почему бы не поговорить об этой лестнице с людьми, что живут вдоль Городничанки, на Завершизне и теми, кто пользуется ею. Подошел к одному дому, к другому... и история лестницы совсем неожиданно для меня в рассказах горожан приобрела черты легенды, имеющей независимо от архивных и других источников право на самостоятельное существование.

Люди мне поведали, что Завершизна как улица возникла сравнительно недавно, сразу после окончания второй мировой войны. А до этого здесь был большой панский сад, вымерзший незадолго перед войной. Низина же по обоим бережкам речки издавна была заселена евреями-ремесленниками. Право на поселение их здесь было якобы дано последним польским королем Станиславом-Августом Понятовским. Вероятно, в связи с этим актом местность эта получила название Юрисдика. Доказательством, что бедный люд селился по течению Городничанки и раньше, мог служить огромный камень-валун с древними письменами, прочесть которые не могли самые авторитетные полиглоты. Камень этот видели на правом берегу речки еще до начала строительства в 70-х годах Дворца пионеров, а потом он куда-то исчез, будто сквозь землю провалился...

Что же касается лестницы, то она, по свидетельству жителей соседних домов, оказалась значительно моложе предполагаемого мною ее возраста. Построили ее в 1942 - начале 1943 года, т.е., еще до уничтожения фашистами в Гродно еврейского гетто. Неизвестно, чем руководствовались оккупационные власти, задумав строительство лестницы, но вряд ли желанием благоустроить город. Скорее, здесь возымел место традиционный немецкий педантизм - наладить должным образом полицейский надзор за населением Переселки и еврейского гетто, узники которого именно по Городничанке, а затем через Неман осуществляли побеги в лес, к партизанам. Узники гетто и явились главными исполнителями задуманного фашистами проекта. Строительный материал приказано было брать тут же рядом, на старейшем в городе еврейском кладбище (сейчас на этом месте... автостоянка, и она находится у самого спуска к Городничанке). Надгробия с могил предков снимались и перетаскивались вручную к месту строительства. Здесь же их при необходимости обрабатывали, подгоняя один к другому, с обязательным условием, чтобы не было видно могильных надписей. Строители лестницы не могли не знать, какая печальная участь уготована им немцами, но они делали свой тяжкий труд, со скорбью поминая и умерших, и живых, робко надеясь на спасение. Но оно не пришло, фашисты уничтожили гетто, в том числе и тех, кто из могильных плит своих родных и близких построил и себе своеобразный памятник.

За многие годы бесхозности лестница сегодня близка к разрушению. Нет до нее дела ни городским властям, ни историко-культурным общественным организациям. Не знают о существовании рядом с центром города памятного места, которое после проведения благоустроительных работ могло бы приносить доход, местные предприниматели, работники экскурсионно-туристических бюро и фирм. Теряем на этом незнании, а на неуважении труда наших земляков и все мы, гродненцы. Будем же памятливыми. Сегодня это так нужно людям.

***В. ЧЕРЕПИЦА,***
***профессор.***

## "Вернісаж" - лаўрэат фестывалю

Шчаслівымі вярталіся з Мінска, з І рэспубліканскага фестывалю "СТЭМ-96" нашы студэнты. Універсітэцкі тэатр эстрадных мініяцюр "Вернісаж" (кіраўнік - Валерый Ляховіч) сабраў там даволі багатыя лаўры, хаця сапернікі былі сталыя і прадстаўлялі 10 калектываў вядучых вну рэспублікі. Фестываль быў арганізаваны Саюзам моладзі Беларусі з мэтай адрадзіць стэмаўскі рух мінулых гадоў, разгледзець новую плеяду студэнцкіх талентаў.

"Вернісаж" выступаў у сваім новым складзе і з новай, даволі цікавай і змястоўнай праграмай "Брэменскія музыкі - 3", або "Старая казка аб галоўным". Старшыня журы Студнеў адзначаў высокі прафесіяналізм самадзейных артыстаў нашага "Вернісажа". Іх праграма была адзначана як самая паэтычная. А ў якасці падарунка "Вернісажу" - лаўрэату фестывалю - быў уручаны фотаапарат "Кодак". Ёсць і здымкі, якія адразу ж пасля ўручэння падарунка зрабіў "Кодакам" Валерый Ляховіч. Поспех спрыяў на фестывалі і гродзенскаму "Канкану", які атрымаў гран-пры. У яго складзе таксама ёсць студэнты нашага універсітэта.

***С. ІВАНОВА.***

*Рэдактар*
С. МУРЫНА
Карэктура
Н.ДУДКО
*Камп'ютарная вёрстка*
Ю.РАДСА
*Камп'ютарны набор*
М.ВЕРСТАК

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404.*
*44-72-97*

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 20.04.96 г.*
*Заказ 25*
*Наклад 500 асобнікаў.*

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №421.

*Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.*